**ГРАНТЫ WARGAMING – ДЛЯ СТУДЭНТАЎ БДУ**
Колькасць стыпендыятаў расце, як і кола факультэтаў
Стар. 2

**ХІМІЯ + ПРАГРАМАВАННЕ? ЧАМУ Б І НЕ!**
Усё больш студэнтаў выбіраюць дадатковыя дысцыпліны
Стар. 3

**ФАКУЛЬТЭТУ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН – 25!**
ФМА актыўна ўплывае на пабудову і вывучэнне міжнароднага іміджу Рэспублікі Беларусь
Стар. 4–5

**ЛІДАР СЯРОД ЛІДАРАЎ**
Студэнтка МДЭІ імя А. Д. Сахарава Аліса СЕЛЯЗНЁВА ўзначаліла інфармацыйную камісію Рэспубліканскага студсаюза
Стар. 7

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

23 лістапада 2020 года, № 13 (2235)

# Шматграннасць у адзінстве

## У БДУ дадзены зваротны адлік да святкавання 100-годдзя ўніверсітэта

Сімвалічную кнопку старту нацыянульні міністр адукацыі Беларусі **Ігар Карпенка**, рэктар БДУ **Андрэй Кароль**, загадчык кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта **Алег Яноўскі** і чацвёртакурсніца факультэта міжнародных адносін **Ульяна Бычкова**. Таймер зваротнага адліку дзён да 30 кастрычніка 2021 года размешчаны на афіцыйным сайце БДУ. Праз год у гэты дзень адбудзецца ўрачысты сход з нагоды векавога юбілею ўніверсітэта. Цырымонія адбылася ў рамках Савета БДУ, прысвечанага дню заснавання ўніверсітэта.

У сваім звароце да ўніверсітэцкай супольнасці Ігар Карпенка адзначыў важную ролю БДУ для ўсёй сучаснай сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусі. Па яго словах, універсітэт выступае флагманам у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў і з'яўляецца унікальным навукова-адукацыйным цэнтрам, вядомым у нашай краіне і за яе межамі. Ігар Карпенка адзначыў, што да свайго стагоддзя БДУ падышоў з сур'ёзным навуковым патэнцыялам, плеядай выдатных педагогаў і выпускнікоў, шырокім спектрам міжнародных кантактаў і інавацыйных праектаў. Міністр выказаў упэўненасць, што БДУ прымножыць традыцыі ўніверсітэцкай адукацыі, і пажадаў усяму калектыву творчых дасягненняў, рэалізацыі сваёй місіі на карысць Беларусі.

Рэктар БДУ Андрэй Кароль павіншаваў прысутных з 99-годдзем і з набліжэннем юбілейнай даты. Па яго словах, супольная стваральная праца ўсяго калектыву дазволіць годна адсвяткаваць 100-годдзе і паказаць усю шматграннасць і адзінства БДУ. «У аснове будучыні любой ВНУ ляжыць карпаратыўны дух. Усё атрымаецца, калі кожны студэнт, выкладчык і супрацоўнік будзе нацэлены на раскрыццё і самарэалізацыю ў кантэксце ўніверсітэцкіх мэт і задач. Дасягненні кожнага незалежна ад сферы прынясуць карысць універсітэту і прывядуць да яго росквіту. Гэта і ёсць аснова магутнага ўніверсітэта XXI стагоддзя, калі рознае злучаецца ў адным», – падкрэсліў Андрэй Кароль.









100 БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

*Рэспубліканскі арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і святкаванні 100-гадовага юбілею БДУ ўзначаліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, выпускнік нашага ўніверсітэта Ігар Сергеенка. Ён ужо праводзіў нарады з прадстаўнікамі як універсітэцкага аргкамітэта, так і рэспубліканскага ў рамках падрыхтоўкі да юбілею. Ужо цяпер на сайце ўніверсітэта адкрыты раздзел, прысвечаны 100-годдзю БДУ. У ім можна знайсці інфармацыю пра ход падрыхтоўкі да юбілею, склады арганізацыйных камітэтаў, каляндар мерапрыемстваў, сімволіку юбілею і г. д. На кожны месяц запланаваны ўніверсітэцкія імпрэзы, якія будуць праходзіць у рамках 100-годдзя. Асобна поўнамаштабна абновіцца матэрыяльна-тэхнічная база. Многія карпусы ўніверсітэта будуць адрамантаваны, а таксама чакаецца некалькі важных для БДУ будоўляў.*

На Савеце БДУ супрацоўнікам былі прысуджаныя званні «Заслужаны работнік», абвешчаныя падзякі рэктара, уручаныя граматы Міністэрства адукацыі Беларусі, прэміі імя У. І. Пічэты і А. Н. Севчанкі, а студэнтам БДУ – пасведчанні спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

УНІВЕРСІТЭТ
23 лістапада 2020 года, № 13 (2235)

# Гранты Wargaming – для студэнтаў БДУ

**Нядаўна сусветна вядомая кампанія Wargaming ужо ў трэці раз заахвоціла студэнтаў БДУ спецыяльнымі грантамі. Колькасць лаўрэатаў расце, як і кола факультэтаў. Мы даведаліся, на якія мэты будзе накіравана грашовая дапамога і як яе атрымаць.**




*Дзмітрый Кіроль, намеснік дырэктара па кадрах СТАА «Гейм Стрым», уручае дыплом і персанальную ўзнагароду Анатолю Кохану*

## Падтрымаць маладыя таленты і навуку Беларусі!

Ці мог больш за 20 гадоў назад студэнт фізічнага факультэта БДУ ўявіць, што стане адным з самых паспяховых прадпрымальнікаў Беларусі? Такая сіла захаплення. **Віктар КІСЛЫ** паспяваў і вывучаць лазерную фізіку і спектраскапію ва ўніверсітэце, і распрацоўваць камп'ютарныя гульні. Першае анлайн-прыкладанне па матывах шахмат ён напісаў у 1996 г., а ўжо ў 1998-ым разам з сямю энтузіястамі заснаваў кампанію, якой давядзецца атрымаць глабальную вядомасць, адчыніць дзясяткі офісаў па ўсім свеце, заслужыць прэстыжныя ўзнагароды і некалькі разоў патрапіць у Кнігу рэкордаў Гінеса.

У 2019 г. саўладальнікі кампаніі Wargaming задаліся пытаннем, як можна падтрымаць родную альма-матар. Адказ знайшлі разам з кіраўніцтвам БДУ – вылучыць спецыяльныя гранты для студэнтаў, якія вырашылі заняцца навуковымі даследаваннямі.

Узнагароджанні тройчы праводзілі сярод чатырох факультэтаў – хімічнага, фізічнага, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій. У цяперашнім семестры колькасць стыпендый вырашылі павялічыць з 16 да 24, а да факультэтаў-удзельнікаў дадалі біялагічны і механіка-матэматычны.

Падаць заяўку можа кожны ахвотнік, акрамя студэнтаў выпускнога курса. Неабходна напісаць матывацыйны ліст, падрыхтаваць аўтабіяграфію і выпіску з пратакола пасяджэння савета факультэта. Важныя фактары – навукова-даследчая дзейнасць і паспяховасць. Сярэдні бал павінен складаць не менш за сем з паловай.

Вынікі конкурсу падводзяць на пасяджэнні камітэта стыпендыі. Журы аналізуе дакументы, вывучае навуковыя публікацыі, матывацыю студэнта, а затым прымае рашэнне з дапамогай таемнага галасавання.

– Зрабіць выбар няпроста, бо кожны ўдзельнік годны перамогі, – гаворыць **Уладзімір КІСЛЫ,** дырэктар кампаніі Wargaming Group Limited. – Займацца навукай і атрымаць маштабную падтрымку ад універсітэта ў такім маладым узросце – значныя дасягненні. Пры прыняцці канчатковага рашэння пра стыпендыятаў мы арыентуемся на іх планы на будучыню. Якія мэты ставіць перад сабой студэнт? У якіх канферэнцыях ён хоча ўдзельнічаць? Як выкарыстоўвае сродкі? Жорсткіх абмежаванняў тут няма, але асноўныя напрамкі – падтрымка кафедры, публікацыя ў аўтарытэтных міжнародных часопісах.

Адмысловую ўвагу надаюць працам на стыку дысцыплін. Так, адно з самых цікавых даследаванняў – вывучэнне рэзанансу клеткі на ўздзеянне лекаў. Фізіка ў тандэме з медыцынай – яркае рашэнне.

Памер адной стыпендыі – дзве тысячы долараў на семестр. Прадстаўнікі кампаніі разлічваюць, што студэнты змогуць набыць на гэтыя грошы неабходныя рэагенты, тэхніку і спецыялізаваную літаратуру, менш турбавацца фінансавымі пытаннямі і цалкам канцэнтравацца на навуковай дзейнасці.

## У Анатоля Кохана – персанальны прыз

Цяперашні пяцікурснік фізічнага факультэта **Анатоль КОХАН** атрымаў ад сузаснавальніка кампаніі Уладзіміра Кіслага персанальную ўзнагароду. Ён апублікаваў 12 навуковых прац за час навучання і тройчы станавіўся стыпендыятам Wargaming.



– Упершыню я даведаўся пра стыпендыю ад сяброў, якія хадзілі на першую прэзентацыю ў рэктарат, – распавёў Анатоль Кохан. – А калі быў на канферэнцыі ў Маскве, мне прапанавалі паўдзельнічаць у конкурсе.

Калі ты займаешся навукай і табе гэта падабаецца, ніякіх праблем з падрыхтоўкай дакументаў і апісаннем сваёй працы паўстаць не павінна.

Персанальная ўзнагарода стала прыемнай нечаканасцю. Дзякуючы дапамозе, якую я атрымаў у лабараторыі і на кафедры, мне ўдалося за 3 гады паспрабаваць шмат напрамкаў у біяфізіцы, вывучыць шмат методык, паўдзельнічаць у напісанні артыкулаў і ў працы канферэнцый, што ў выніку і склалася ў добрую навуковую працу.

У ёй я надаю ўвагу двум напрамкам, звязаным адзін з адным. Гэта электрафізіялогія трамбацытаў і ўплыў іонных каналаў мембраны на іх фізіялагічныя і патафізіялагічныя функцыі, а таксама біяфізіка бялкоў, якія ўдзельнічаюць у запаленчых працэсах. У далейшым я буду імкнуцца ўключаць у працу яшчэ і мадэляванне ўнутрыклетачных працэсаў.

Цяпер я рыхтуюся да паездкі ў Дрэздэн для ўдзелу ў распрацоўцы чыпа для электрафізіялогіі клетак крыві. У дадатак я купіў ноўтбук, які выдатна спраўляецца з мадэляваннем складаных біялагічных працэсаў, у прыватнасці, згортвання крыві.

## Выдаткаваць стыпендыю на новыя веды




Студэнт другога курса хімічнага факультэта **Глеб ПАЗНЯК** упершыню пра стыпендыю Wargaming даведаўся яшчэ напачатку вучобы ад саміх прадстаўнікоў кампаніі, якія прыйшлі ва ўніверсітэт.

– Я задумаўся пра тое, каб падаць заяўку, але на той момант яшчэ не займаўся навуковай дзейнасцю, – успамінае Глеб. – На другім курсе я пачаў даследаванні на кафедры высокамалекулярных злучэнняў НДІ ФХП БДУ пад кіраўніцтвам кандыдата хімічных навук Яраслава Вячаслававіча Фалетрава. Увесну 2020 года падаў заяўку – і выйграў стыпендыю.

Галіна маіх навуковых інтарэсаў – сінтэз біяарганічных злучэнняў, якія валодаюць флуарэсцэнтнымі ўласцівасцямі і могуць выкарыстоўвацца ў розных мэтах. Напрыклад, для адсочвання працэсаў, якія адбываюцца з пэўнай малекулай унутры арганізма.

Стыпендыю я планую выдаткаваць на закупку таго, што трэба для правядзення далейшых даследаванняў, а таксама на самаразвіццё. Вядома, усю суму адразу не выдаткую, буду купляць неабходныя матэрыялы падчас працы.

З камп'ютарам я на «ты», трохі захапляюся праграмаваннем на мове Python, але ў якасці асноўнай прафесіі ІТ-сферу не разглядаў. У сучасным свеце без камп'ютара ўжо не абысціся, і ІТ-тэхналогіі цесна кантактуюць з хімічнай навукай. Так што хто ведае, дзе буду працаваць праз пару гадоў.

## У сучасных даследаваннях без высокіх тэхналогій

Студэнтка трэцяга курса факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій **Вікторыя ШАМКІНА** пра магчымасць атрымаць стыпендыю Wargaming пачула ад сяброўкі, затым убачыла пост у групе факультэта і вырашыла паспрабаваць.



– Для ўдзелу я падрыхтавала матывацыйны ліст і аўтабіяграфію, атрымала рэкамендацыю і, вядома, прадэманстравала сваю навуковую працу, – распавядае Вікторыя. – Я займаюся даследаваннем у галіне біяінфарматыкі. Распрацоўваю тэму «Нармалізацыя даных секвеніравання адзінкавых клетак пры дапамозе метаду незалежных кампанентаў». Напрамак набірае папулярнасць і мае вялікае значэнне для будучыні.

Грошы я хачу выдаткаваць на неабходныя для даследаванняў рэсурсы. Вядома, нядрэнна было б наведваць навуковыя канферэнцыі, але, на жаль, сусветная сітуацыя ўнесла карэкціроўкі ў мае планы.

Дарэчы, акрамя біяінфарматыкі, мне цікавы напрамак data science. Таму ў будучыні я цалкам магла б паспрабаваць сябе ў ІТ-сферы.

## На стыку хіміі і ІТ

Студэнтцы трэцяга курса хімічнага факультэта **Вікторыі СТАРАВОЙТАВАЙ** пра стыпендыю распавёў Яраслаў Вячаслававіч Фалетраў.



– Мне здаецца, самым важным і складаным стала напісанне аўтабіяграфіі і эсэ, у якім трэба было выказаць сутнасць навуковага праекта, – лічыць Вікторыя. – Канкрэтна ў гэтым конкурсе я ўдзельнічала ўпершыню, але за плячыма ў мяне ўжо шмат падобных. Тэма майго праекта – «Віртуальны пошук злучэнняў-інгібітараў некаторых ферментаў, якія іграюць важную ролю ў патагенезе пэўных відаў раку».

Мне цікавая біяінфарматыка, а дакладней распрацоўка праграмнага забеспячэння для правядзення даследаванняў у галіне біялогіі і хіміі.

У дадзены момант я займаюся распрацоўкай ПЗ для правядзення і аўтаматызацыі малекулярнага докінгу. Для віртуальнага пошуку патрэбны магутны камп'ютар, які я і хачу набыць з дапамогай стыпендыі.

Сваю будучыню бачу на стыку ІТ і прыродазнаўчых навук. Зараз я заканчваю хімічны факультэт, паралельна вывучаю працу з базамі даных, а таксама некаторыя мовы праграмавання і біялогію.

**Кацярына КАРДАШ**

З 2019 года ў БДУ з'явілася магчымасць вывучаць дадатковыя дысцыпліны. Летась іх наведвала каля 10 чалавек, сёлета – у два разы больш. Мы спыталі студэнтаў, чаму яны абралі менавіта гэтыя прадметы і ці складана сумяшчаць сваю вучобу з заняткамі на іншым факультэце.



# Хімія + праграмаванне? Чаму б і не!

**Яна ЦЯРЛЕЦКАЯ, 4 курс, філалагічны факультэт.**



*Дадатковыя дысцыпліны: «Тэорыя перакладу ўсходняй мовы (кітайская мова)», «Асновы менеджменту», «Інфармацыйныя тэхналогіі ў міжнародным турызме», «PR і рэклама: сацыялагічнае забеспячэнне».*

– У мінулым семестры я абрала тры дысцыпліны на факультэце міжнародных адносін. Прычына простая: мне вельмі захацелася паспрабаваць штосьці яшчэ. Заняткі праходзілі па стандартнай схеме: спачатку лекцыі, затым практычныя. Пазней мы перайшлі ў фармат дыстанцыйнага навучання, таму ў мяне не было праблем з тым, каб сумяшчаць вучобу на сваім факультэце з дадатковымі дысцыплінамі. Мае чаканні цалкам апраўдаліся, не было ніякіх нюансаў ні з боку майго факультэта, ні з боку таго, які прымаў. У гэтым семестры я таксама вырашыла паспрабаваць яшчэ адну цікавую для мяне сферу: «PR і рэклама: сацыялагічнае забеспячэнне» на ФФСН. Першапачаткова я хацела запісацца на гэту дысцыпліну яшчэ летась, але яна не падышла мне па раскладзе. Цяпер заняткі праходзяць па суботах, і гэта вельмі зручна. Вывучаю гэты прадмет з другім курсам, усе таварыскія і прыязныя. Выкладчык вельмі кампетэнтны і дасведчаны. Мне цікавы гэты прадмет, таму іспыт я буду здаваць абавязкова, каб мець дадатак да дыплома.

**Водгук выкладчыка Вольгі КІРВЕЛЬ, кандыдата эканамічных навук, дацэнта:**



– Студэнты спецыяльнасці «сусветная эканоміка» пазітыўна адрэагавалі на навіну, што з імі будзе вучыцца чалавек з іншага факультэта, і, на маю думку, Яна ў групе пачувалася камфортна. На лекцыях студэнтка актыўна ўдзельнічала ў абмеркаванні праблемных пытанняў і сітуацый. Курс «Асновы менеджменту» з'яўляецца гуманітарнай дысцыплінай, магчыма, таму яе вывучэнне не выклікала складанасцяў у студэнткі філалагічнага факультэта. Некаторыя цяжкасці ўзніклі ва ўмовах навучання з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, напрыклад, рэгістрацыя на адукацыйным партале запатрабавала дадатковых высілкаў, але Яна самастойна з гэтым справілася. Я думаю, асаблівасці выкладання для людзей з іншых сфер заключаюцца перш за ўсё ў індывідуальным падыходзе да студэнта. У гэтай сітуацыі асабліва прадуктыўным з'яўляюцца асабістыя зносіны з навучэнцамі, і, вядома, патрэбныя намаганні з боку выкладчыка і студэнта для дасягнення жаданых вынікаў. Яна Цярлецкая справілася з навучальнай праграмай курса і выклікала станоўчае ўражанне: добрасумленная, адказная, самастойная, ініцыятыўная і камунікабельная студэнтка. Цікавасць Яны да атрымання новых ведаў дазволіла ёй вывучыць дысцыпліну «Асновы менеджменту» і павысіць узровень інтэлектуальнага і асобаснага развіцця.

**Ганна ЧЫГІР, 2 курс, гістарычны факультэт**



*Дадатковая дысцыпліна: «Тэорыя і практыка перамоў», ФМА.*

– Тады я яшчэ вучылася на першым курсе, а «Тэорыю і практыку перамоў» праходзіла разам з трэцякурснікамі. Было вельмі нязвыкла сядзець у адной аўдыторыі з людзьмі, з якімі не знаёмая. Бо аднагруппнікі – гэта ўжо сфарміраваны калектыў, а я зусім чужы для іх чалавек. Але, калі атрымліваеш веды – не час саромецца. Цяпер успрымаю гэту магчымасць як унікальную, таму што з-за несупадзення змен ніколі больш не змагу атрымліваць веды са студэнтамі спецыяльнасці «міжнародныя адносіны». Я не прыкладала асаблівых высілкаў для сумяшчэння. Проста пасля заняткаў ішла на ФМА. Гэта было задавальненне. Да таго ж, супадаў профіль ведаў. Цікава было, калі пачалося дыстанцыйнае навучанне на факультэце міжнародных адносін. Я сядзела на пары па «Палеаграфіі» на гістарычным факультэце ў навушніках, каб слухаць лекцыю па «Тэорыі і практыцы перамоў». Чаканні апраўдаліся, скажу больш: я чакала меншага. У выніку нават атрымала публікацыю ў зборніку студэнцкага вучонага савета ФМА.

**Ксенія СІТНІК, 2 курс, факультэт журналістыкі.**



*Дадатковая дысцыпліна: «Псіхалогія», ФФСН.*

– Усё здарылася спантанна. Мне даўно падабалася псіхалогія, і я ведала пра магчымасць вывучаць дадатковыя дысцыпліны іншых факультэтаў. Аднойчы толькі артыкулаў у блогах псіхолагаў мне стала занадта мала, і я вырашыла сур'ёзна ўзяцца за гэты прадмет. Гэта думка прыйшла да мяне, па іроніі лёсу, у апошні дзень падачы заявы. Было цяжка паспець аформіць усе дакументы, аднак усё атрымалася добра. Спачатку занятку праходзілі проста і цікава, але ўсюды ёсць і свае складанасці. Група, з якой я займаюся, ужо праходзіла псіхалогію ў мінулым семестры, гэта значыць, яны зрабілі палову шляху, нават залік здалі. Мне ж трэба будзе здзейсніць рывок у духу «пяцігодку за чатыры гады», бо прадмет складаны, ды і мысленне для разумення псіхалагічных дысцыплін павінна быць трохі іншым.

З-за каранавіруса мы займаемся дыстанцыйна, але мэта семінараў ад гэтага не мяняецца: выкладчык задае пытанні, група разважае, прагназуе. Але ў «жывым» фармаце, думаю, гэта было б цікавей.

Я так пазітыўна гавару пра ўсе складанасці не толькі таму, што мне падабаецца прадмет. Мне пашанцавала і з выкладчыкамі. Калі шчыра, я вельмі баялася, што мая «нетутэйшасць» у плане факультэта будзе замінаць. Але выкладчыкі заўсёды ідуць на кантакт, дапамагаюць задавальняць мае інтарэсы ў галіне псіхалогіі. Гэта матывуе займацца яшчэ больш рупліва, таму што спыняцца на адным прадмеце я не збіраюся.

Практыка дадатковых дысцыплін можа быць складанай толькі ў адным пункце: несупадзенне раскладаў факультэтаў. Мне і тут пашанцавала. А далей пытанне толькі жадання, вольнага часу і адказнасці. Калі гэта ўсё ёсць, нічога не страшна! Вы адчуваеце, як з кожным семінарам становіцеся больш прафесійнымі, адукаванымі. Хіба гэта можа не натхняць?

**Уладзімір ГРЫНЬКО, 3 курс, юрыдычны факультэт.**



*Дадатковыя дысцыпліны: «Крыміналістыка» і «Юрыдычная псіхалогія».*

– Я наведваю крыміналістыку і юрыдычную псіхалогію. Абраў менавіта іх, таму што хачу стаць следчым. Мне цікавыя пытанні тактыкі і методыкі расследавання злачынстваў, а таксама пытанні, якія тычацца асобы злачынца і маральна дапушчальных спосабаў уздзеяння на яе. Адказы на гэтыя пытанні змяшчаюцца ў абраных мною курсах. Мне зусім нескладана сумяшчаць гэтулькі дысцыплін, і чаканні цалкам апраўдаліся. Кваліфікаваныя выкладчыкі з глыбокімі навуковымі ведамі і практычным досведам аказваюць неабходную дапамогу па канкрэтных навуковых пытаннях і рэкамендуюць карысную літаратуру.

**Уладзіслава БАБУЛЬ, 4 курс, хімічны факультэт.**



*Дадатковая дысцыпліна: «Праграмаванне», ФПМІ.*

– Я наведваю заняткі з групай першага курса. Абрала менавіта гэтую дысцыпліну, таму што ў далейшым хачу звязаць сваю працу з праграмаваннем. Ці цяжка мне сумяшчаць такія розныя спецыяльнасці? Вядома, курс нялёгкі. Гэта асновы, але цяпер мы ўжо пачалі вывучаць канкрэтную мову – C++. Мне вельмі падабаецца прадмет, схема выкладання, ды і спецыфіка заняткаў на двух факультэтах адна: спачатку лекцыі, потым практычныя. Група, з якой я наведваю дадатковую дысцыпліну, актыўная і прыязная. Я сама па сабе вельмі добразычлівы чалавек, таму на кантакт пайшла адразу ж. Цяпер я добра камунікую з некаторымі першакурснікамі і па-за заняткамі. Так, мне складана, калі ўлічваць, што я сама вучуся на хімічным факультэце. Мне трэба ведаць шматлікія рэчы ў галіне хіміі і сумяшчаць іх з C++. Але я ніколі не адчайваюся. Трэба ўсяго толькі перабудаваць сваё мысленне з хімічных формул на формулы моў праграмавання – і ўсё атрымаецца!

**Аляксандра ПЕРАВОЗНІКАВА**

## АБ'ЯВЫ

### БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС**

**НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай хіміі; экалогіі чалавека; геаграфічнай экалогіі.

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай хіміі; геаграфічнай экалогіі.

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій; клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін; батанікі; біяхіміі; фізікі цвёрдага цела; лазернай фізікі і спектраскапіі; экалогіі чалавека.

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій; радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій; геадэзіі і касмааэракартаграфіі; агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі; тэорыі і практыкі перакладу.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне па рабоце з персаналам, тэл. 209-54-36.*

### ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛА БДУ

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС**

**НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: багаслоўя, рэлігіязнаўства.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 24, каб. 209, тэл. +375 (17) 327-55-71.*

### НДІ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ БДУ

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС**

**НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ВЯДУЧАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА: лабараторыя моцнатокавай электронікі – 1.

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА: лабараторыя моцнатокавай электронікі – 2; лабараторыя нанаэлектрамагнетызму – 1.

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА: лабараторыя моцнатокавай электронікі – 1; лабараторыя эксперыментальнай фізікі высокіх энергій – 1;

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31.*

### НДІ ПРЫКЛАДНЫХ ПРАБЛЕМ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС**

**НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ**

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА навукова-даследчай лабараторыі праблем бяспекі інфармацыйных тэхналогій.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, п. 802, НДІ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі, тэл. 209-51-04.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**У БДУ дадзены зваротны адлік да святкавання 100-годдзя ўніверсітэта** – БелТА, sb.by, zviazda.by, СТБ, АНТ, Беларусь-1, Беларусь-24, «Мінск-навіны», mlyn.by (30.10).

**Выстава абразоў і духоўнай літаратуры «Абразы Маці Боскай» прайшла ва ўніверсітэце** – БелТА, sb.by, zviazda.by (06.10), Беларусь-1, Беларусь-24 (13.10).

**Стыпендыі Wargaming атрымалі 24 студэнты БДУ** – БелТА, dev.by, yandex.by (08.10), zviazda.by (09.10), adukar.by (12.10).

**Пра новы сезон праекта «Студэнт на тыдзень»** – «Звязда» (10.10), «Мінск-навіны» (11.10), zviazda.by (12.10), mlyn.by (13.10), «Настаўніцкая газета», «Звязда» (15.10), radio1.by (20.10).

**У БДУ распрацоўваюць камп'ютарную мадэль імплантата па прадухіленні пераломy шыйкі сцягна** – БелТА, sb.by, «Мінск-навіны», vkurier.info, yandex.by (13.10), «Экапрэс» (14.10).

**Цэнтр падтрымкі тэхналогій і інавацый створаны ва ўніверсітэце** – БелТА, edu.gov.by, «Экапрэс», primepress.by, dev.by, yandex.by (14.10), zviazda.by, sb.by (15.10), «Настаўніцкая газета» (17.10).

**Навукоўцы-географы БДУ распрацавалі тэхналогію прагнозу нафтаперспектыўных аб'ектаў** – БелТА, «Інтэрфакс», nangs.org, «Экапрэс», yandex.by (21.10), zviazda.by (22.10).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
23 лістапада 2020 года, № 13 (2235)








# І гэта толькі пачатак!

**Факультэту міжнародных адносін – 25! Дэкан ФМА Віктар ШАДУРСКІ адкрыта распавёў, чаму папулярнасць факультэта тлумачыцца не толькі «блізкасцю да чыгуначнага вакзала».**

**– Віктар Генадзьевіч, назавіце асноўныя вехі ў развіцці факультэта за гэтыя 25 гадоў, якія навуковыя школы тут склаліся?**

– 1 кастрычніка 1995 г. рэктар БДУ Фёдар Мікалаевіч Капуцкі падпісаў загад пра стварэнне на ўніверсітэце новага падраздзялення – факультэта міжнародных адносін. Гэта падзея дала старт гісторыі ФМА БДУ. Можна сказаць, факультэту пашанцавала нарадзіцца ў патрэбным месцы ў патрэбны час і з патрэбнымі людзьмі. Пра гэта можа шмат распавесці наш першы дэкан прафесар Аляксандр Віктаравіч Шарапа. Спадзяёмся ўбачыць яго мемуары.

Хацелася б вылучыць яшчэ дзве падзеі, звязаныя з сур'ёзным прагрэсам у развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы факультэта: атрыманне ФМА асобнага адрамантаванага будынка (вуліца Акадэмічная, 25) увосень 1997 г. і яго пераезд у сучасны корпус на вуліцы Ленінградскай у 2012 г. Добра вядома, што абалонка (будынак) мае важнае значэнне. Аднак яшчэ важнейшае тое, хто ў ім працуе і вучыцца. Можна ганарыцца, што на ўсіх 6 факультэцкіх спецыяльнасцях сфарміраваны і паспяхова развіваюцца навуковыя школы. Асабліва ўражвае школа даследавання міжнародных адносін і знешняй палітыкі Беларусі, якая ўключае больш за 10 дактароў навук і некалькі дзясяткаў кандыдатаў навук. Яе прадстаўнікі апублікавалі тысячы навуковых публікацый, у тым ліку буйных, а таксама за мяжой. Без аўтарытэтнага меркавання навукоўцаў факультэта сёння цяжка сабе ўявіць любое сур'ёзнае навуковае мерапрыемства, прысвечанае міжнароднай праблематыцы, у нашай краіне. І гэта толькі пачатак!



**– Кім цяпер працуюць вашы найбольш бачныя выпускнікі?**

– Ведаеце, просьба назваць найлепшых выпускнікоў звычайна ставіць мяне ў няёмкае становішча, выклікае, як кажуць, «кагнітыўны дысананс». Якія крытэрыі ўзяць за аснову выбару? Займаная пасада? Назапашаныя матэрыяльныя багацці? Чалавечая прыстойнасць? Ці аказаная роднаму факультэту дапамога? На жаль, не ведаю, як склаліся лёсы ва ўсіх 8597 выпускнікоў ФМА, у тым ліку каля 1000 замежных грамадзян. Сярод нашых былых студэнтаў пяцёра прадстаўляюць Беларусь у якасці паслоў, сотні выпускнікоў працуюць на адказных дыпламатычных пастах і ў міжнародных арганізацыях. Ёсць сярод нашых гадаванцаў паспяховыя бізнесмены, спартсмены. Адна наша выпускніца выхоўвае пяцёра дзяцей. А можа, і не адна?! Вельмі сур'ёзная місія! Так што магу назваць толькі аднаго былога студэнта ФМА, які быў адлічаны за пропускі заняткаў. Гэта Макс Корж! Нават складана сабе ўявіць, чаго дамагаюцца выпускнікі, якія атрымалі дыплом, тым больш з адзнакай.

**– Распавядзіце пра спецыяльнасці на факультэце, іх актуальнасць для Беларусі.**

– Да моманту стварэння ФМА на трох факультэтах універсітэта функцыянавалі спецыяльнасці (аддзяленні): міжнародныя адносіны, міжнароднае права, міжнародныя эканамічныя адносіны. Менавіта яны склалі аснову новага падраздзялення БДУ. Пазней былі створаны яшчэ тры спецыяльнасці: менеджмент у сферы міжнароднага турызму, мытная справа і лінгвакраіназнаўства (усходазнаўства). Па ўсіх пералічаных спецыяльнасцях вядзецца інтэнсіўная падрыхтоўка будучых спецыялістаў для міжнароднай сферы Рэспублікі Беларусь з ведамі 2 замежных моў. Варта адзначыць, што многія студэнты не абмяжоўваюцца толькі дзвюма замежнымі мовамі.

Не пабаюся высокіх слоў і скажу, што факультэт міжнародных адносін БДУ можна справядліва лічыць адным з важных сімвалаў незалежнай Беларусі. Міністр замежных спраў Уладзімір Макей у адным інтэрв'ю назваў наш факультэт школай беларускай дыпламатыі – фактычна беларускай дыпламатычнай акадэміяй.

**– ФМА запатрабаваны ў абітурыентаў, у вас заўсёды вельмі высокі конкурс і прахадныя балы. Чаму паступіць сюды лічыцца прэстыжным, нейкай прыкметай «элітарнасці»?**

– На мой погляд, галоўнае дасягненне ФМА БДУ за 25 гадоў складаецца ў тым, што ён набыў і не страціў давер абітурыентаў, якія мараць сюды паступіць і вучыцца. Так, у 2020 г. з 8 абітурыентаў, якія абралі БДУ для вучобы і мелі больш за 390 балаў, 4 паступілі на наш факультэт. Гэта ўжо стала нейкім трэндам. Добра вядомая ўстойлівая сувязь паміж паняццямі «найлепшы абітурыент» – «добры студэнт» – «выдатны спецыяліст». Гэта тычыцца не толькі беларускіх юнакоў і дзяўчат, але і моладзі з іншых краін, перш за ўсё з рэспублік былога СССР.

Высокая рэпутацыя ФМА БДУ існуе не толькі дзякуючы назве «міжнародны» і размяшчэнню новага корпуса насупраць чыгуначнага і аўтобуснага вакзалаў (на гэтым настойваюць некаторыя «злыя языкі»), але галоўным чынам дзякуючы дзейнасці высокапрафесійных выкладчыкаў і супрацоўнікаў, якія разам са студэнтамі і выпускнікамі ствараюць адмысловую творчую атмасферу (універсітэцкі дух). Многія з нашых добразычліўцаў адзначаюць, што на факультэце культывуецца вялікая цікавасць і адкрытасць да іншых культур і моў, крытычнае стаўленне да ведаў. На вучобу да нас ідуць ужо дзеці выпускнікоў ФМА. Ці не гэта яркае пацвярджэнне якаснай адукацыі, якая адкрывае шырокія прафесійныя магчымасці?!

**– Якім чынам вашы студэнты набываюць неабходныя кампетэнцыі і наколькі яны гатовыя да рэальных умоў працы?**

– Не сакрэт, што вучыцца на факультэт паступаюць маладыя амбіцыйныя рамантыкі (а часам і цынікі (!)). Некаторыя з іх прыходзяць з «завышанымі» планамі. Прызнаю ў якасці адной з рэальных праблем пэўны дысбаланс паміж чаканнямі студэнтаў па набыцці ведаў і навыкаў, якія, як яны мяркуюць, будуць патрэбныя ў іх будучай прафесіі, з аднаго боку, і рэальнымі магчымасцямі выкладчыкаў – з іншага. Каб ліквідаваць гэты ўмоўны «разрыў», факультэт актыўна далучае студэнтаў да навукова-практычнай дзейнасці, у разнастайныя міжнародныя адукацыйныя праекты, а таксама ў іншыя грамадска значныя ініцыятывы. За высокімі вынікамі выступленняў нашых студэнтаў на прэстыжных міжнародных спаборніцтвах па міжнародным праве, эканоміцы стаіць шматмесячная карпатлівая падрыхтоўка. Мы таксама стымулюем частковае працаўладкаванне па спецыяльнасці яшчэ ў студэнцкія гады. Галоўнае, каб у студэнтаў як мага раней фарміравалася рэальнае ўяўленне пра будучую працоўную дзейнасць, пра ўзаемаадносіны ў працоўным калектыве, пра імператыў вучыцца на працягу ўсяго жыцця. Прыклады паспяховай дзейнасці нашых выпускнікоў ва ўсіх сферах можна пералічваць вельмі доўга і з вялікім задавальненнем.

**– Прадстаўце падрабязней «візітоўку» факультэта: чым ён вядомы і чым адрозніваецца ад іншых факультэтаў.**

– Яркіх асаблівасцяў у факультэта вельмі шмат, і ўсе яны маюць значэнне. Напрыклад, ФМА – самы буйны факультэт Беларусі па колькасці студэнтаў дзённай формы навучання (каля 2000 студэнтаў), па колькасці студэнтаў платнай формы (больш за 80 %). Як ні дзіўна, за колькасныя параметры факультэт нярэдка крытыкуюць, у тым ліку высокапастаўленыя службоўцы – навошта, кажуць, рыхтаваць для Беларусі столькі дыпламатаў?! Адказваю: ФМА рыхтуе спецыялістаў для розных напрамкаў (галін) міжнароднай сферы. Многія з нашых выпускнікоў праходзяць старанны адбор і ідуць на працу ў дыпламатыю. Пра шырокі спектр магчымага прымянення нашых студэнтаў сведчаць ужо самі назвы спецыяльнасцяў. Міжнародная сфера мае вострую патрэбу ў прытоку спецыялістаў.

Прызнаюся, што дэканат, разумеючы сваю адказнасць за якасць навучання, за працаўладкаванне выпускнікоў, ніколі не выступаў ініцыятарам колькаснага росту ФМА. У той жа час факультэт неаднаразова выкарыстоўваўся для вырашэння канфліктаў, звязаных з недзяржаўнымі ВНУ. У выніку рэарганізацыі апошніх на ФМА пераводзіліся сотні студэнтаў. Як вынік, мы запрашалі на працу дзясяткі новых выкладчыкаў. Сёння на кафедрах ФМА працуюць 22 прафесары і дактары навук, 95 кандыдатаў навук, амаль 200 выкладчыкаў замежных моў. Зараз універсітэт набірае на факультэт шмат студэнтаў, у тым ліку каб захаваць выкладчыцкі калектыў. Вось такая няхітрая схема.

Мы таксама рады нашаму яркаму будынку, у якім мы вучымся ўжо больш за 8 гадоў. На факультэце выкладаецца 17 замежных моў. Выпускнікі іх нядрэнна ведаюць. Плануем адкрыць факультатывы па новых «рэдкіх» мовах.

Яшчэ адзін паказчык: за 25 гадоў выкладчыкі забяспечылі навучальны працэс падручнікамі і навучальнымі дапаможнікамі. Выйшла 25 тамоў студэнцкіх навуковых прац. Выдаецца навуковы часопіс на беларускай і рускай мовах, а таксама «Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Міжнародныя адносіны» на англійскай мове. Выстава навучальных і навуковых выданняў ФМА ўражвае.

Пералічваць нашы дасягненні можна вельмі доўга! Як і праблемы і перспектывы.



*Студэнты спецыяльнасці «Мытная справа» – пераможцы III Універсітэцкай алімпіяды па англійскай мове*




*Каманда ФМА – чэмпіёны Еўропы па міжнародным касмічным праве*

**– Са студэнтамі ФМА часта сустракаюцца паслы розных краін і прадстаўнікі міжнародных арганізацый. Хто іх ініцыруе і якія сустрэчы, на Ваш погляд, былі найбольш цікавымі?**

– На факультэце ўвесь час выступаюць беларускія і замежныя навукоўцы, палітыкі, прадстаўнікі культуры і бізнесу. Яны дзеляцца з моладдзю глыбокімі тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі, сваім станоўчым, а часам і адмоўным досведам. Як правіла, замежныя госці наведваюць факультэт у рамках праграмы афіцыйных візітаў, г. зн. без якога-небудзь фінансавання з нашага боку. Нашы студэнты заўсёды задаюць шмат пытанняў, у тым ліку на замежных мовах. Пасля такіх сустрэч вельмі прыемна атрымліваць лісты з высокай ацэнкай узроўню падрыхтоўкі студэнтаў ФМА. Маем станоўчыя водгукі ад намесніка кіраўніка Сусветнай гандлёвай арганізацыі, міністра замежных спраў Венгрыі, прэзідэнта Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа, дзясяткаў іншых вядомых асоб.

Найбольш часта выступаюць на факультэце паслы замежных краін. Як правіла, гэтыя сустрэчы праходзяць па ініцыятыве саміх паслоў. Некаторыя з іх імкнуцца ў сваіх выступленнях абыходзіць вострыя тэмы, прамаўляюць нарыхтаваныя тэксты. Усё адно гэтыя сустрэчы карысныя для будучых міжнароднікаў. Студэнты назіраюць манеры дыпламатаў, іх уменне парыраваць каверзныя пытанні і г. д. Яны пачынаюць лепш разумець рэальную дыпламатыю.

**– Што пажадаеце ФМА з нагоды 25-годдзя?**

– Памятаю, як у адным савецкім фільме ў школьнікаў спыталі, чаго яны хочуць больш за ўсё. Тыя адказалі, што хочуць, каб іх разумелі дарослыя!

Я жадаю, каб ФМА БДУ больш разумелі людзі, якія яго атачаюць! Каб мы ўнутры нашага вялікага калектыву добра разумелі адзін аднаго. Я хачу, каб нас слухалі і чулі ў дзяржаве і грамадстве (нашы ідэі і прапановы, вынікі навуковых даследаванняў). Каб да выкладчыкаў і студэнтаў факультэта людзі збоку ставіліся без залішняга захаплення, але і не спрабавалі беспадстаўна зняважыць, што мы нібыта «далёкія ад простага народу і рэальнага жыцця»! Поспехаў нам усім!

**Гутарыў
Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

## Міжнародныя праграмы, конкурсы і даследчая дзейнасць

Студэнты ФМА вядомыя выдатнай падрыхтоўкай і перамогамі на міжнародных конкурсах. Іх на факультэце курыруе дацэнт **Алена КОНАВА**, загадчыца кафедры міжнароднага права, кандыдат юрыдычных навук:



– Штогод супрацоўнікі ФМА БДУ бяруць удзел у больш чым 30 міжнародных адукацыйных праектах. Гэта праграмы Еўрапейскага саюза Compass, Erasmus+, «Жан Манэ» і іншыя. Яны фінансуюцца як міжнароднымі арганізацыямі і фондамі (ЮНЕСКА, ЮНФПА, Вышаградскі фонд, Савет Еўропы і інш.), так і нацыянальнымі фондамі еўрапейскіх дзяржаў (DAAD (Германія), фонд «Еўразія» (ЗША), праграма супрацоўніцтва з Нарвегіяй і інш.). На ФМА БДУ размешчаны нацыянальны цэнтр праграмы «Балтыйскі ўніверсітэт» (Швецыя) і Цэнтр па правах чалавека, які накіраваны на ўзмацненне міжуніверсітэцкага ўзаемадзеяння па міждысцыплінарных даследаваннях. Доўгі час выкладчыкі факультэта бралі ўдзел у акадэмічным супрацоўніцтве з Інстытутам імя Р. Валенберга (Лунд, Швецыя). У рамках супрацоўніцтва быў падрыхтаваны шэраг выданняў па выкладанні правоў чалавека, ажыццёўлены шэраг ініцыятыў у галіне гендарных роўнасці.

Апошняе дзесяцігоддзе характарызуецца актывізацыяй удзелу студэнтаў у міжнародных спаборніцтвах па міжнародным праве. Студэнцкія каманды факультэта сталі паказваць бліскучыя вынікі, умацоўваючы прэстыж універсітэта і беларускай адукацыі ў цэлым за мяжой. У скарбонцы факультэта шэраг міжнародных узнагарод, уключаючы першыя і другія месцы на міжнародных спаборніцтвах па міжнародным праве імя Джэсапа, па міжнародным касмічным праве імя Лахса, па міжнародным гуманітарным праве імя Мартэнса і іншых.

Студэнты маюць магчымасці для апрабацыі вынікаў сваіх навуковых даследаванняў. Напрыклад, на штогадовай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ, дзе на 75 секцыях гучыць больш за 250 дакладаў. Пераможцы маюць магчымасць апублікаваць тэзісы сваіх выступленняў. Студэнты старэйшых курсаў могуць у суаўтарстве з навуковымі кіраўнікамі ўдзельнічаць у штогадовай навукова-практычнай канферэнцыі маладых навукоўцаў ФМА «Міжнародныя адносіны: гісторыя, тэорыя, практыка» з публікацыяй матэрыялаў.

На факультэце выдаецца «Зборнік навуковых артыкулаў студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў». Толькі летась было выдадзена два выпускі, у якіх было апублікавана каля 300 артыкулаў. Улічваючы міждысцыплінарны характар факультэта, у зборніку прадугледжаны разнапланавыя напрамкі даследаванняў: гісторыя, паліталогія, міжнародныя адносіны; дзяржава і права, юрыспрудэнцыя; менеджмент, маркетынг; фінансы і банкаўская справа, эканоміка; міжнародны турызм; мытная справа; культуралогія; сучасныя замежныя мовы; лінгвакраіназнаўства і інш.

Арганізацыі навуковай дзейнасці моладзі спрыяюць студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі, якія функцыянуюць на факультэце. Іх пяць: СНДЛ «Знешняя палітыка і дыпламатыя ў сучасных міжнародных адносінах: прыкладны аналіз»; СНДЛ «Інавацыйныя тэхналогіі ў турызме», СНДЛ «Тэорыя і практыка мытнай справы і знешнеэканамічнай дзейнасці», СНДЛ «Аналітык», СНДЛ «Эканаміст-міжнароднік» і больш за 30 студэнцкіх гурткоў і клубаў.

За ўвесь час выйшла 25 тамоў студэнцкіх навуковых прац.

Аўтары найлепшых курсавых, дыпломных прац рэкамендуюцца для публікацыі ў электронным зборніку навуковых артыкулаў «Найлепшыя працы студэнтаў НДРС ФМА». Летась было апублікавана звыш 50 прац.

Прыемна адзначыць фарміраванне супольнасці студэнтаў, выпускнікоў і выкладчыкаў факультэта, якія разам укладваюць свае таленты і сілы ў поспехі ўніверсітэцкіх каманд. Асабліва радуе, што нашы выпускнікі, якія дамагаюцца прафесійных поспехаў, вяртаюцца ў alma mater і на добраахвотніцкіх пачатках перадаюць набытыя навыкі і веды студэнтам, аддаючы сотні гадзін асабістага часу на карысць маладому пакаленню і іміджу ўніверсітэта.

## Актыўнасці на любы густ

На факультэце прадстаўлены ўсе ўніверсітэцкія студэнцкія арганізацыі. Студэнцкі савет па якасці адукацыі – месца, дзе студэнты працуюць над тым, каб зрабіць працэс навучання больш эфектыўным, цікавым і разнастайным. ССЯА праводзіць апытанні, анкетаванні, інтэлектуальныя гульні, а таксама падтрымлівае пастаянную сувязь студэнтаў з выкладчыкамі і адміністрацыяй факультэта для стварэння камфортнай атмасферы і абмену меркаваннямі. Студэнцкі саюз арганізоўвае самыя гучныя мерапрыемствы: «Вялікія гонкі», «Капуснік», «Містар ФМА» і «Міс ФМА», а таксама праводзіць акцыі ў гонар святаў. Творчы саюз збірае танцораў, спевакоў і музыкаў для канцэртаў і выступленняў. Пра жыццё студэнтаў распавёў студэнт 4 курса **Уладзіслаў БЕЙНАР**:



– Студэнцкае жыццё на ФМА – гэта дзясяткі сустрэч з замежнымі гасцямі, сотні мерапрыемстваў і тысячы таленавітых і актыўных студэнтаў! Двойчы ў год праводзіцца «Мадэляванне ААН», на якім студэнты прымяраюць на сябе ролі прадстаўнікоў дзяржаў, набываюць дыпламатычныя, прамоўніцкія і моўныя навыкі. Нельга не згадаць студэнцкі навуковы савет, праект «Старт», заняткі па іўрыце, карэйскай мове і шмат чаго іншага.

На факультэце створаны ўсе ўмовы для рэалізацыі сябе ў розных галінах. Што да мяне, то я быў старшынёй ССЯА і намеснікам старшыні прафкама. Мы арганізоўвалі сустрэчы з замежнымі гасцямі, праводзілі мерапрыемствы, прысвечаныя розным значным падзеям і святочным датам, дапамагалі студэнтам, займаліся пытаннямі павышэння якасці адукацыі. Я вывучаў правы чалавека ў летняй школе Лундскага ўніверсітэта, абменьваўся досведам самакіравання са студэнтамі ў Аўстрыі, Славакіі, Чэхіі і Нідэрландах. Наяўнасць праграм студэнцкай мабільнасці дазволіла мне правесці год у Шанхаі, дзе я вывучаў кітайскую мову, культуру і традыцыі. Напрыканцы вучобы на ФМА многія ўжо сумяшчаюць яе з працай ці стажыроўкамі, ствараючы моцную аснову для будучага кар'ернага росту.

З упэўненасцю магу сказаць, што набытыя ў сценах ФМА веды і навыкі дазваляюць рэалізаваць сябе ў шматлікіх галінах, пачынаючы з міжнароднага бізнесу, дыпламатыі, журналістыкі і кансалтынгу і заканчваючы палітыкай, працай у міжнародных арганізацыях, навуковай дзейнасці.

## Выходзіць за межы штодзённага

Выпускніца 2015 г. **Аляксандра ШКОДА**, 2 сакратар МЗС Беларусі:



– ФМА, безумоўна, дае выдатную гуманітарную базу ведаў, але не ў гэтым яго галоўная «фішка». Выкладчыкі факультэта дапамагаюць сфарміраваць сучасны светапогляд, прышчапляюць уменне нестандартна глядзець на рэчы, выходзіць пры рашэнні любых задач за межы штодзённага. Вучаць думаць, шукаць сваю праўду, не зважаць на аўтарытэты. І, на мой погляд, гэта вельмі каштоўна. Я адчуваю дух факультэта ў кожнай інфармацыйнай акцыі МЗС, у кожным падрыхтаваным дакуменце, да якіх я прыкладаю руку. Гэта аснова, якую не заўсёды можна звесці да канкрэтных прыкладаў, проста ведаеш, што яна ёсць – такі своеасаблівы тыл. Моўныя веды, атрыманыя тут, дазваляюць перакладаць на мерапрыемствах даволі высокага ўзроўню, напрыклад, на прэс-канферэнцыі па выніках сустрэчы Асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы.

Маё студэнцтва было вельмі яркім! Акрамя навучальных момантаў, гэта сустрэчы з цікавымі людзьмі, удзел у міжнародных канферэнцыях, замежных стажыроўках, праца ў органах студэнцкага самакіравання. Я не магу нават уявіць свае студэнцкія гады без любімых і бязмерна паважаных В. Г. Шадурскага, С. В. Карэліна, А. А. Разанава, М. Э. Часноўскага, Р. М. Турарбекавай, Ю. І. Малевіч, Л. М. Муслімавай… Я магу працягваць гэта спіс бясконца доўга. Гэта тыя людзі, якія падарылі мне столькі цудоўных магчымасцяў, ведаў, эмоцый, цяпла! Для мяне яны і ёсць ФМА, мой самы галоўны і самы родны ўспамін!

**Гутарыла
Надзея МАРХЕЛЬ**

УНІВЕРСІТЭТ
23 лістапада 2020 года, № 13 (2235)

# Стартап-цэнтр БДУ ўсталёўвае стасункі паміж бізнесам, адукацыяй і навукай

Каб запусціць удалы бізнес у студэнцтве, вялікія грошы ўкладваць у яго зусім неабавязкова. Галоўнае – гарэць ідэяй, атачаць сябе аднадумцамі, добрымі ментарамі-практыкамі і экспертамі. У гэтым упэўнены кіраўнік стартап-цэнтра БДУ **Дзмітрый МІКУЛКА**. Ён распавёў, што паказаў год працы з прадпрымальнікамі-пачаткоўцамі, чаму ў сценах універсітэта студэнты пакуль масава не адкрываюць стартапы і якія крокі трэба распачаць, каб матываваць моладзь развіваць прадпрымальніцкае мысленне.



***– Дзмітрый Іванавіч, за першы год развіцця стартап-цэнтра ва ўніверсітэце вы правялі дзве стартап-школы, хакатон, навучальныя семінары. Ці быў гэты год прадуктыўным? Які досвед набылі?***

– Самае цікавае, што наша арганізацыя – гэта таксама пэўны стартап. Першы год мы актыўна вывучалі найлепшыя сусветныя методыкі па развіцці прадпрымальніцтва ва ўніверсітэтах (еўрапейскія, амерыканскія, расійскія, кітайскія). Не толькі арганізоўвалі падобныя мерапрыемствы, але і вывучалі ў цэлым стартап-рух у Беларусі, назапашвалі вопыт і завязвалі знаёмствы. Напрыклад, каб запусціць першую стартап-школу, сталі партнёрамі з «Грамадствам садзейнічання інавацыйнаму бізнесу», што дазволіла атрымаць доступ да базы практыкуючых бізнес-трэнераў і спікераў. Так склалася ў нашай краіне, што навучаць, як запусціць уласны бізнес, не зусім акадэмічная дысцыпліна.

Розныя стартап-ініцыятывы імкнуцца развіваць у буйных ВНУ (у БНТУ, БДУІР, ГрДУ і інш.). Але класічнага бізнес-інкубатара пакуль няма ні ў адным беларускім універсітэце. Сусветны досвед паказвае, што для рэалізацыі такой ініцыятывы неабходна адпаведнае кадравае забеспячэнне спецыялістамі рознага профілю (у класічным універсітэцкім інкубатары ў сярэднім 10 ставак персаналу), развіццё інфраструктуры і матэрыяльна-тэхнічнай базы, укараненне сістэмы адбору і падрыхтоўкі праектаў, фарміраванне партнёрскай сеткі. Пакуль гэта даволі складана і праблематычна, бо патрэбны рэсурсы і час.

Увесь гэты год мы спрабавалі высветліць, чаму ў стартап-школы студэнты не ідуць масава. Папрацаваўшы з імі, зразумелі, што ў іх ёсць нейкі скепсіс да развіцця прадпрымальніцтва ў дзяржаўнай сістэме. Яны сумняваюцца, што ўніверсітэт можа дапамагчы ў развіцці стартап-праектаў. Ёсць насцярожанасць, што сучаснае акадэмічнае асяроддзе не спрыяе стварэнню сваёй справы, развіццю прадпрымальніцкага мыслення. Студэнты спрабуюць адшукаць гэтыя веды і атрымаць навыкі ў іншых арганізацыях.

На першы год працы паставілі для сябе вялікую мэту – паказаць, што гэтаму можна навучыцца ў сценах універсітэта, прычым эфектыўней, чым у іншых месцах, для чаго трэба проста выбудаваць правільную сістэму праз пэўны прадпрымальніцкі рух.

***– Пад эфектыўнасцю вы маеце на ўвазе хуткае атрыманне прыбытку са стартапа?***

– Трэба разумець, што мы імкнёмся развіваць стартапы не толькі ў іх класічным разуменні. Таму што звычайна з гэтым паняццем звязваюць хуткі рост, атрыманне інвестыцый. Для нас стартап – любы пачатковы прадпрымальніцкі праект. Для іх эфектыўнасць – гэта не зачыніцца ў першы год пасля адкрыцця.

Найбольшы патэнцыял у праектаў,у аснове якіх інавацыйная дзейнасць. Гэта гісторыі пра тое, як стварыць новы лекавы прэпарат, адкрыць сацыяльную сетку ці распрацаваць унікальны мабільны дадатак. Адзін з такіх цікавых праектаў, які ў 2019 годзе стаў рэзідэнтам тэхнапарка «Унітэхпрам БДУ», прадугледжвае стварэнне фермы скарпіёнаў. Разводзіць іх плануюць для атрымання яду ў фармацэўтычных мэтах.

Гэта значыць, на хуткія грошы, развіваючы падобныя стартапы, разлічваць не варта. Такія праекты павінны «стрэліць». Толькі тады яны прынясуць велізарны прыбытак і не меншую практычную значнасць. Хачу звярнуць увагу, што прадказаць ці прадбачыць, якія праекты стануць паспяховымі, даволі складана. Таму, калі вам кажуць, што вы прыдумалі чарговае глупства, апускаць рукі не варта. Для пачатку ідэю проста трэба прапанаваць рынку і паглядзець, ці гатовы яе хтосьці купляць. Вынік можа быць зусім неверагодны.

Ацэньваючы эфектыўнасць нашай працы, то мы вызначылі, што гэты паказчык залежыць ад таго, колькі бізнесаў студэнты змогуць з нашай дапамогай запусціць і развіваць далей. Калі мы на гэта станоўча паўплывалі, значыць, усе высілкі не дарма. Таму што можна арганізаваць мноства школ, семінараў, мерапрыемстваў. Але калі да развіцця хоць бы адзінкавых бізнес-праектаў (у тым ліку інавацыйных) яны не прыводзяць, то эфектыўнасці ў гэтым няма.

***– Што трэба для таго, каб студэнт змог не проста прыдумаць унікальную бізнес-ідэю, а рэалізаваць яе на практыцы?***

– Першы сезон нашай школы даў нядрэнную канверсію. З васьмі ўдзельнікаў тры ўжо практычна развіваюць свае прадпрымальніцкія ідэі. Клінінгавае агенцтва Cleaning BSU займаецца ўборкай інтэрнатаў. Яго кіраўнік *Дыяна Кавалёва* сама жыла ў інтэрнаце, доўгі час узначальвала розныя грамадскія арганізацыі на базе Студгарадка БДУ і разумела, што праблема ёсць, попыт на гэта існуе. Адгэтуль першыя замовы і эфектыўнасць. Пра апошнюю гаварыць можа хоць бы праз два гады працы. Бо праз нейкі час многія стартапы маюць уласцівасць згасаць і зачыняцца. Другі праект Fresh Bar BSU хутка пачне працу на эканамічным факультэце. Першых капірайтараў ужо пачала навучаць «Школа рэдактараў».

Наш досвед паказвае, што вельмі важнае асяроддзе, ці кам'юніці, у якое трапляюць тыя, хто мае інтарэс да прадпрымальніцкай дзейнасці, – так званы нэтворкінг. Удзельнікі нашых ініцыятыў бачаць, што ў іх студэнцкім асяроддзі яны не адны такія: з вар'яцкімі бізнес-ідэямі, захопленымі вачыма і жаданнем зарабляць. Гэта матывуе, дазваляе абменьвацца досведам.

У першым сезоне нашай школы мы запрашалі экспертаў-практыкаў, якія падштурхоўвалі да актыўных дзеянняў. Распавядалі, як напісаць першы ў жыцці бізнес-план, падлічыць фінансы, вывучыць попыт і прапанову. Дзякуючы чаму шмат хто пераадолеў страхі. Зразумелі, што адкрыць бізнес не штосьці вельмі завоблачнае, працаглае і выдатковае.

Бо многія студэнты думаюць стэрэатыпамі ці апраўдваюць сваю бяздзейнасць аргументам, што для адкрыцця сваёй справы патрэбныя вялікія грошы. Мы і нашы эксперты дапамагаем зразумець, што гэта не так. Некаторыя бізнесы стартуюць і з нулявым капіталам. Распавядаем пра інвестыцыі, дапамагаем шукаць інвестараў, напрыклад, у супольнасці бізнес-анёлаў. Каб дасягнуць нейкіх вынікаў, многія студэнты маюць патрэбу ў кантролі. Мы дапамагалі сачыць за паслядоўным выкананнем усіх крокаў, весці справаздачнасць. Але досвед паказаў, што такія методыкі не зусім эфектыўныя, шмат ад чаго трэба адмовіцца і змяняць падыходы.

***– З улікам гэтых назіранняў вы істотна перакроілі план працы на гэты навучальны год. У якіх напрамках плануеце развіваць працу стартап-цэнтра?***

– Па-першае, нам варта пашырыць прадпрымальніцкае кам'юніці. Далучыць да яго як мага больш людзей з інтарэсамі да прадпрымальніцтва. Для гэтага трэба сфарміраваць моладзевы рух. У гэтым ужо дапамагае студэнцкі саюз, які прапанаваў нам партнёрства ў сферы развіцця стартапаў. 17 верасня мы запусцілі праект Startup Space. Удзельнікі самастойна арганізоўваюць сустрэчы з даследчанымі прадпрымальнікамі, трэнерамі і ментарамі, івэнты рознага фармату. Першае з такіх мерапрыемстваў пад назвай HIDAY прайшло 29 верасня. Яго наведалі каля 200 студэнтаў. З іх 150 запісаліся на адукацыйную праграму. Вынікі навучання падвядуць да старту прадпрымальніцкага форуму, які плануем правесці 18 лістапада. Да гэтага дня студэнты змогуць пазнаёміцца, пагутарыць, абмеркаваць свае ідэі, прыдумаць прататыпы прадуктаў і сфарміраваць каманды для працы.

Вядома, на гэтым этапе многія адсеюцца. І гэта нармальны прынцып селекцыі. Калі вобразна гаварыць, каб выраслі прафесіяналы ўзроўню Месі з Раналда, у футбол павінны гуляць мільёны. Каб у краіне з'явіліся некалькі выбітных бізнесменаў, паспрабаваць сябе ў прадпрымальніцтве павінны дзясяткі тысяч. Наш стартап-цэнтр зможа прыцягнуць працу са студэнтамі з высокай матывацыяй. Такім чынам, мы не будзем марнаваць час на тых, хто яшчэ не гатовы да актыўнай працы. Магчыма, не кожны з іх адкрые сваю буйную справу, але многія з іх змогуць працягнуць працаваць на чыйсьці бізнес менеджарамі, кіраўнікамі праектаў і быць паспяховымі.

Па-другое, досвед паказаў, што ўдзельнікі нашых школ разам з намі павінны глыбей і больш дэталёва прадумваць свае праекты. Для гэтага мы распрацоўваем палажэнне пра сістэму інкубацыі стартап-цэнтра. Ужо сфарміраваным камандам мы зможам прапанаваць сістэму рэзідэнцтва стартап-цэнтра, дзякуючы чаму для кожнага з праектаў будзе рыхтавацца дарожная карта. Па сутнасці, гэта падрабязны пакрокавы план, які прывядзе да атрымання першага прыбытку. Складаюць яе спецыялісты, якія называюцца трэкерамі. Яны ведаюць, як дзейнічаць на кожным з этапаў развіцця праекта, і расстаўляюць метрыкі ў дарожнай карце. Пакуль дадзеную прафесію мы самі асвойваем на курсах, вывучаем напрацоўкі замежных калегаў. У перспектыве хочам адкрыць сваю школу трэкераў, таму што ў нашай краіне такія спецыялісты пакуль адзінкавыя, таму на іх будзе высокі попыт.

У працы з кожным праектам будзем практыкаваць індывідуальны падыход. Паспрабуем адмаўляцца ад агульных тэм, ментараў, экспертаў шырокага профілю. Зразумелі, што «агульная» вучоба мае нізкую эфектыўнасць. Веды для будучых прадпрымальнікаў павінны быць прыкладнымі. У інтэрнэце ёсць мільёны якасных лекцый у адкрытым доступе ад спікераў сусветнага ўзроўню. Трэкеры будуць падказваць, якія тэмы вывучыць, правяраць засвоены матэрыял. Далей веды трэба будзе прымяняць ужо на практыцы. Мы будзем дапамагаць, у тым ліку пры дапамозе партнёрскай сеткі стартап-цэнтра.

Па-трэцяе, мы павінны ўсталяваць сувязь з фінансавымі інстытутамі, каб дапамагаць у прыцягненні першых інвестыцый і грантаў. Будзем развіваць сваю партнёрскую сетку. У яе будуць уваходзіць не толькі эксперты і ментары, але і фінансавыя інстытуты (банкі, Беларускі фонд фінансавай падтрымкі прадпрымальніцтва, бізнес-анёлы), якія будуць гатовыя купіць прадукт ці ўкласці сродкі ў яго развіццё.

Па-чацвёртае, мы павінны развіваць інфраструктуру, каб у студэнтаў была свая і анлайнавая, і рэальная прастора для зносін і працы. Для гэтага хочам стварыць уласны каворкінг на базе будучага бізнес-інкубатара. Цяпер вядзём перамовы з двума банкамі, якія ў сваіх аддзяленнях арганізоўваюць цэнтры для прыцягнення прадпрымальніцтва. Такія камфортныя сучасныя прасторы змогуць стаць часовым другім домам для нашых будучых прадпрымальнікаў. У перспектыве, магчыма, зможам абзавесціся ўласным падобным памяшканнем для адкрыцця паўнавартаснага бізнес-інкубатара. Ён дазволіць павялічыць колькасць людзей, з якімі будзем праводзіць працу, дапаможа ўзмацніць іх матывацыю. А для арганізацыі працы і зносін у інтэрнэце ствараем спецыяльны сайт.

Па-пятае, у перспектыве ставім для сябе больш глабальную задачу – звязаць бізнес-ініцыятывы і навуку, каб не толькі распрацоўваць інавацыйны прадукт, але і прадаваць яго. У ідэале неабходна звязаць навуковы патэнцыял нашых кваліфікаваных выкладчыкаў, маладых навукоўцаў, магчымасці лабараторый з энергіяй маладых людзей, якія будуць гатовыя рызыкаваць і прасоўваць гэтыя напрацоўкі на рынку.

Таму сумесна з Галоўным упраўленнем адукацыйнай дзейнасці ўжо цяпер распрацоўваем палажэнне пра праектна-навучальную дзейнасць, накіраванае на тое, каб прадпрымальніцкія праекты станавіліся навучальнай нагрузкай: міждысцыплінарнымі курсавымі ці дыпломнымі працамі. Было б выдатна, каб над імі студэнты маглі працаваць камандамі і прыцягваць аднадумцаў. Напрыклад, над распрацоўкай мабільнага прыкладання могуць працаваць будучыя дызайнеры, распрацоўшчыкі, тэсціроўшчыкі, капірайтары, маркетолагі.

А ці будуць такія методыкі эфектыўныя, пакажа толькі час.

**Марыя ШНА**

У верасні студэнтка трэцяга курса Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А. Д. Сахарава **Аліса СЕЛЯЗНЁВА** ўзначаліла інфармацыйную камісію Грамадскага рэспубліканскага студэнцкага саюза. Пры гэтым ужо год дзяўчына з'яўляецца лідарам каардынацыйнага савета Студэнцкага гарадка БДУ. У інтэрв'ю «Універсітэту» Аліса распавяла, якую карысць студэнтам прыносяць такія арганізацыі, як сумяшчаць вучобу і грамадскую нагрузку і дзе чэрпаць на ўсё сілы.



**Родны горад:** Лёзна
**Знак задыяка:** Леў
**Хобі:** рыбалка са спінінгам
**Натхненне:** эстэтыка, SMM, якасная візуальная інфармацыя, мантаж і здымка
**Моцныя бакі:** лідарства, камунікабельнасць, жаданне пастаянна развівацца

# Лідар сярод лідараў

***– Як у тваім жыцці з'явілася студэнцкае самакіраванне?***

– Як толькі паступіла ва ўніверсітэт, адразу ж задумалася пра тое, што хачу актыўнае студэнцкае жыццё, новыя знаёмствы, асаблівую атмасферу. Вырашыла, што для гэтага трэба далучыцца да якой-небудзь арганізацыі. З першага курса жыву ў інтэрнаце № 4. Дзяўчына, якая курыравала нашу групу ва ўніверсітэце на першым курсе і працавала ў студсавеце аднаго з інтэрнатаў, параіла мне гэту арганізацыю. Тады якраз у нашай «чацвёрцы» рыхтаваліся да маштабнага дня нараджэння і шукалі ў дапамогу стажораў. Я зрабіла афішу і пасля гэтага стала працаваць у інфармацыйнай камісіі.

***– Чаму навучыў студсавет? Якія функцыі выконвае гэта арганізацыя?***

– Праца ў студсавеце, вобразна кажучы, нагадвае час, калі жывеш з бацькамі. Цябе як быццам з усіх бакоў засцерагаюць, падказваюць, у калектыве пануе дух згуртаванай сям'і. Ты адказваеш не толькі за сябе, але і за іншых людзей з арганізацыі, ды і ў цэлым за студэнтаў, якія тут пражываюць. Бо каманда студсавета наўпрост адказвае за развіццё інтэрната: арганізацыю мерапрыемстваў, кантроль за чысцінёй, парадкам і бяспекай, за інфармацыйнае суправаджэнне ўсяго жыцця ў сценах інтэрната, за ўзаемадзеянне паміж адміністрацыяй і студэнтамі і рашэнне шматлікіх праблем на лакальным узроўні.

Паколькі я працавала ў інфармацыйнай камісіі, мне даводзілася займацца складаннем анонсаў, пост-рэлізаў, стварэннем афіш. Праз нейкі час даручылі адміністраваць групу нашага інтэрната ў сацыяльных сетках і рабіць фатаграфіі з мерапрыемстваў. Успамінаю зараз некаторыя свае шэдэўры з усмешкай, таму што многага тады не ўмела. Цяпер і вярстаць нядрэнна навучылася, і з фатаграфіяй пасябравала. Шмат у чым дапамаглі студэнты, з якімі даводзілася працаваць. Таму рэкамендую па новыя навыкі адпраўляцца ў стударганізацыі.

***– Што такое каардынацыйны савет? Як ён дапамагае студэнтам?***

– У каардынацыйны савет (КС) уваходзяць лідары самакіравання васьмі інтэрнатаў Студгарадка БДУ, а таксама старшыні некалькіх арганізацый: СТК (спартыўна-турысцкі клуб), ГІС (грамадска-інфармацыйная служба), СТЛ (студэнцкая творчая лабараторыя) і ССБ (студэнцкая служба бяспекі).

КС дапамагае згуртаваць лідараў, выбудаваць паміж імі дыялог, наладзіць абмен досведам, сабраць усе мясцовыя праблемы інтэрнатаў і знайсці рашэнні. Па сутнасці, гэта арганізацыя накіравана на фарміраванне «адміністрацыі» студэнцкага самакіравання. Члены КС таксама з'яўляюцца пасрэднікамі ва ўзаемадзеянні студэнтаў з адміністрацыяй студэнцкага гарадка.

А такая пасяховая камунікацыя прыносіць практычную карысць. Добры прыклад таму – велапаркоўка, якую арганізавалі ў інтэрнаце № 11. Студэнты даўно хацелі мець месца, дзе можна пакідаць свае веласіпеды. Дзякуючы лідарам самакіравання вывучылі попыт. Пасля пытанне вынеслі на абмеркаванне ў КС – мы тэму падтрымалі. А пасля здолелі данесці важнасць велапаркоўкі да адміністрацыі. І цяпер яна дае карысць іншым.

Ёсць і мноства лакальных праблем, якія вырашаюцца дзякуючы самакіраванню інтэрнатаў. Вось яшчэ адзін прыклад. У «чацвёрцы» пасля II Еўрапейскіх гульняў засталіся вялікія ложкі з вялікімі матрацамі. Жыхары скардзяцца, што пасцельная бялізна не падыходзіць па памеры, увесь час збіваецца. Цяпер працуем над гэтым пытаннем сумесна з кастэлянкай, каб усім было камфортна.

Мы рэгулярна праводзім сходы з КС, шмат размаўляем, арганізоўваем агульныя мерапрыемствы. Самыя папулярныя з іх – квест для першакурснікаў «Сутычка» і псіхалагічны трэнінг «Барацьба характараў», якія вучыць адстойваць свае правы, камунікаваць, не губляць самавалодання ў любой сітуацыі.

У цэлым, апошняе паўгоддзе выдалася даволі спакойным у плане мерапрыемстваў з-за пандэміі. Вырашылі паспрабаваць працу ў анлайн-фармаце і арганізавалі ў межах конкурсу «Найлепшы моладзевы праект» адукацыйную праграму для студэнцкага актыву Project Connect. Гэта прамыя эфіры з лідарамі студэнцкага руху студгарадка. Імкнуліся запісваць нейкія цікавыя рубрыкі, напрыклад, майстар-клас па зарадцы. Анлайн навучалі SMM.

***– Якімі якасцямі валодае лідар КС? Як ім стаць?***

– З КС я пазнаёмілася падчас пражывання ў інтэрнаце № 3. Туды мы часова перасяліліся ў сувязі з правядзеннем II Еўрапейскіх гульняў, і мне прапанавалі ўзначаліць студсавет «тройкі». Мой шлях да лідарства ў гэтай арганізацыі вельмі незвычайны. Па традыцыі старшыню выбіраюць на выніковым выязным мерапрыемстве ў САК «Брыганціна» ўвесну. Для гэтага трэба прадставіць праграму, візітоўку, творчы нумар. А галасуе за адну з трох кандыдатур студактыў. Я прайшла ў другі тур, але не выйграла выбары. Так скляліся абставіны, што абраны старшыня ў хуткім часе змушаны быў пакінуць свой пост, і я яго замяніла ў кастрычніку мінулага года.

Старшыня каардынацыйнага савета выконвае функцыю арганізатара і мадэратара. Плануе сходы (праводзяцца раз у два тыдні), ініцыіруе позву, кантралюе працэс



працы над мерапрыемствамі. Па сутнасці, гэта лідар сярод 20 лідараў, які яшчэ стварае ўмовы, каб актыву камфортна было працаваць разам, генераваць ідэі. Цяпер мая галоўная мэта – зрабіць з членаў КС згуртаваную каманду. Каб, калі ў красавіку прыйдзе новы старшыня, яму было прасцей.

***– Распавядзі пра сваю працу ў Грамадскім рэспубліканскім студэнцкім савеце і ў цэлым пра арганізацыю.***

– У склад савета ўваходзяць прадстаўнікі студактыву больш як з 50 універсітэтаў усёй краіны. Мэта гэтай арганізацыі – стварыць вялікае студэнцкае кам'юніці, дзе хлопцы і дзяўчаты змогуць працаваць над праблемамі сваіх навучальных устаноў, абмяркоўваць іх, дзяліцца досведам, знаходзіць правільныя рашэнні. Калі ўзнікне неабходнасць, даводзіць іх да міністэрства.

У гэтай арганізацыі створаны тры сектары: сацыяльных ініцыятыў, кантролю і якасці адукацыі і інфармацыйны. Я ўзначальваю апошні з пералічаных. Пакуль працаваць будзем у камандзе з сямі чалавек. Наша мэта – навучыцца якасна асвятляць універсітэцкія падзеі: праз афішы, паблікі ў сацыяльных сетках, матэрыялы ў СМІ.

Пагутарыўшы са студэнтамі на працягу месяца, я зразумела, што ў БДУ на вельмі высокім узроўні развіта інфармацыйнае суправаджэнне. Яны нядрэнна працуюць у сацсетках, маюць базавыя навыкі SMM, валодаюць рознымі графічнымі рэдактарамі і праграмамі па мантажы відэа, апрацоўцы даных.

На жаль, у шматлікіх ВНУ гэта пакуль не вельмі развіта ці толькі пачынае развівацца. Мы хочам гэта выправіць. Бо якасная інфармацыйная абгортка – гэта як «адзенне», як важная частка іміджу ўніверсітэта, студэнцкай арганізацыі, інтэрната.

Я ў першы месяц працы падабрала навучальную інфармацыю, распрацавала заданні. Цяпер студэнты іх выконваюць. Наступная сустрэча з удзельнікамі ГРСС запланавана ў лістападзе. Абмяркуем прамежкавыя вынікі і працягнем далей працаваць у гэтым напрамку.

***– Як у цябе атрымліваецца сумяшчаць актыўнае грамадскае жыццё і вучобу?***

– Насамрэч, я нейкі час сама задавалася гэтым пытаннем. Я вельмі шмат увагі надавала мерапрыемствам, падрыхтоўцы да іх, працы ў арганізацыях. І часцяком гэта шкодзіла маёй вучобе. Спачатку я не ўмела дамаўляцца з выкладчыкамі. Прыйшлося на трэцім курсе змяніць спецыяльнасць, каб было лягчэй усё сумяшчаць.

Таму, маючы такі досвед, раю ўсім, хто хоча весці актыўнае грамадскае жыццё, навучыцца правільна ўпісваць яго ў рамкі вучобы. Гэта складана, але неабходна. Трэба загадзя падыходзіць да выкладчыкаў, распавядаць пра тое, хто вы, чым займаецеся, чаму часам вымушаны прапускаць заняткі. Адразу цікавіцца, як вы можаце іх адпрацаваць. Пры магчымасці прыходзіць хоць бы на палову пары, а не цалкам яе ігнараваць. А часам умець гаварыць «не» і адмаўляць – у жыцці гэта важна і трэба.

Асновы тайм-менеджменту таксама вельмі дапамагаюць у вучобе і ў жыцці. Пачаць можна з простага – складаць графік ці расклад на дзень. Карысны ў гэтай справе мабільныя дадаткі.

***– Як звычайна адпачываеш ад вучобы і грамадскага жыцця?***

– Люблю глядзець на прыгожыя і якасныя акаўнты блогераў у сацыяльных сетках – мяне гэта матывуе. Хачу далей прафесійна развівацца ў гэтай сферы, каб хобі магло ператварыцца ў працу. Гляджу майстар-класы, вучуся мантажу відэа. Чытаю вельмі шмат кніг пра стрэс, як яму не паддавацца. І мне гэта дапамагае выбудоўваць баланс паміж адпачынкам, працай, вучобай і блізкімі людзьмі.

А вольны час люблю праводзіць на прыродзе. Нядаўна, напрыклад, адкрыла для сябе рыбалку са спінінгам. Магу ўсю нядзелю з 9 да 18 гадзін правесці ў лодцы на хвалях, разгружаць мозг такім чынам і радавацца жыццю.

**Гутарыла**
**Марыя ШНА**



Арына Храпунова



# Каманда мары з інт. №2

**Для студэнцкага актыву Студгарадка БДУ САК «Брыганціна» стаў традыцыйным месцам правядзення шматлікіх выязных мерапрыемстваў. Але сёлета складаная эпідэміялагічная сітуацыя ўнесла свае карэкціроўкі, і доўгачаканы семінар-практыкум «Брыганціна–2020. Лідар. Каманда. Вынік» быў пераведзены ў анлайн-фармат. Гэта акалічнасць не стала перашкодай, і 20–21 кастрычніка ўдзельнікаў чакала насычаная праграма.**

Традыцыйны зварот адміністрацыі студэнцкага гарадка да сваіх актывістаў сёлета гучаў не са сцэны САК «Брыганціна», а ў прамым эфіры студгарадка ў Instagram. Каманды студэнцкіх саветаў інтэрнатаў і арганізацый студэнцкага гарадка падрыхтавалі арыгінальныя фотавізіткі, якія адлюстравалі іх творчыя здольнасці і прадэманстравалі ўменне працаваць супольна.

Трэба адзначыць, што ўсе адразу ўключыліся ў працу і добра сябе праявілі. Падчас першага трэнінгу, прысвечанага камандаўтварэнню, хлопцы і дзяўчаты азнаёміліся з цікавай лекцыяй і стварылі вобраз сваёй каманды. Затым даведаліся, як развівацца ў сваёй справе і змагацца з пракрастынацыяй, на трэнінгу «Прадуктыўнасць 2.0». А пра тое, як справіцца са стрэсам і трымаць пад кантролем эмоцыі, распавялі на трэнінгу «Антыстрэс». Першы дзень семінара-практыкума завяршыў *анлайн-квест*, перамогу ў якім атрымала каманда інтэрната БДУ № 6. Як гавораць самі ўдзельнікі, усе задачы вырашаліся хутка, таму што каманда амаль адразу стала адзіным механізмам. Кожны змог выявіць сябе ў разнастайных і незвычайных заданнях. Усе працавалі разам, і гэта дало вынік.

У другі дзень семінара на *трэнінгу*, прысвечаным дзелавой камунікацыі, даведаліся пра прынцыпы дзелавых зносін і сістэму кадзіравання інфармацыі. А падчас урачыстага закрыцця і падвядзення вынікаў працы *адукацыйнай праграмы CONNECT*, якая доўжылася 10 месяцаў, зразумелі, як важна выкарыстоўваць магчымасць выявіць сябе і спрабаваць свае сілы ў розных напрамках.

Па выніках працы праекта былі ўзнагароджаны самыя актыўныя ўдзельнікі і тыя, хто добра сябе выявіў. Кіраўнікі напрамкаў падзякавалі студэнтам за плённую працу і выказалі ўпэўненасць, што ўдзел у праекце стаў для іх каштоўным досведам.

Галоўным мерапрыемствам другога дня семінара стаў заключны этап конкурсу «Студэнцкі лідар года», які прайшоў у актавай зале інтэрната № 7. За гэта званне змагаліся: *Цімафей Мельнік* (інтэрнат № 1), *Арына Храпунова* (інтэрнат № 2), *Цімафей Логвін* (інтэрнат № 3), *Кірыл Зорычаў* (інтэрнат № 4), *Лізавета Шашко* (інтэрнат № 6), *Цімафей Філюціч* (інтэрнат № 7), *Кірыл Дзямешка* (інтэрнат № 10), *Ангеліна Кананові*ч (інтэрнат № 11). Каб журы змагло максімальна аб'ектыўна вызначыць, хто сярод лідараў найлепшы з лепшых і чыя каманда самая дружная і згуртаваная, канкурсанты прайшлі некалькі выпрабаванняў.

На першым этапе кандыдаты адказалі на пытанні псіхалагічнага тэсціравання. Затым падалі творча аформленыя папкі лідараў: футбольны мяч, чамадан лідара, сапраўдны стэнд – усё гэта – творчасць лідараў і іх згуртаваных каманд. Фінальнымі выпрабаваннямі сталі конкурс «Свабодная трыбуна» і творчая самапрэзентацыя, якая сёлета прайшла ў відэафармаце.

Тэма «Як нараджаюцца ідэі?» была абвешчана ў момант пачатку конкурсу «Свабодная трыбуна». Для падрыхтоўкі да выступлення, якое павінна доўжыцца не больш за 2 хвіліны, лідарам была адведзена гадзіна. І, трэба адзначыць, гэты час яны правялі з карысцю! Развагі на тэму значнасці і своеасаблівасці ідэй, іх узаемасувязі з нашым паўсядзённым жыццём не пакінулі абыякавымі членаў журы і прысутных у зале.

Лідары прыклалі максімум намаганняў, таму журы прыйшлося нялёгка пры вызначэнні найлепшага. Хваляваліся і ўдзельнікі. Але ўвесь гэты час іх актыўна падтрымлівалі каманды, у тым ліку і ў сацыяльных сетках Студэнцкага гарадка БДУ, дзе быў арганізаваны анлайн-флэшмоб.

Падчас семінара-практыкума кожны з кандыдатаў выдатна сябе выявіў і пацвердзіў сваё званне лідара. Але асаблівым гэты дзень стаў для **Арыны Храпуновай**. Па выніках конкурсу старшыня студэнцкага савета інтэрната № 2 была прызнана студэнцкім лідарам 2020 года, а каманда студэнцкага савета інтэрната атрымала перамогу ў конкурсе «Каманда мары».

– Я вельмі ганаруся, што прадстаўляла інтэрнат № 2, і шчаслівая, што ўсё завяршылася менавіта так. Я вельмі ўдзячная сваёй камандзе за падтрымку. Наша згуртаванасць і жаданне ісці да выніку былі той рухальнай сілай, якая прывяла нас да перамогі, – гаворыць Арына.

– Ацэньваць было вельмі складана, бо кожны з удзельнікаў унікальны і ўжо з'яўляецца лідарам у сваім інтэрнаце. Яны зрабілі велізарную працу. Немагчыма вылучыць кагосьці аднаго, але мы імкнуліся падысці да ацэнкі канкурсантаў максімальна аб'ектыўна, – дзеліцца ўражаннямі **Яўгенія Кашлей** – начальнік цэнтра метадычнага забеспячэння рэалізацыі моладзевай палітыкі ў студэнцкім гарадку БДУ, член журы конкурсу «Студэнцкі лідар года».

«Брыганціна–2020» адбылася. Семінар-практыкум «Лідар. Каманда. Вынік» завершаны. І хай доўгачаканыя мерапрыемствы прайшлі не ў першапачаткова запланаваным фармаце, затое зараз ні ў кога не застаецца сумневаў, што для актывістаў і супрацоўнікаў студэнцкага гарадка няма нічога немагчымага і невыканальнага.

**Дар'я ХОМІЧ**
**Фота: Арцём ІВАНОЎ**
**і Мікіта КУРЗАЎ**






Удзельнікі конкурса «Студэнцкі лідар года» і члены журы

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты –
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам
інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082
ад 21 студзеня 2010 года

23 лістапада 2020 года
Падпісана да друку 20.11.2020 г.
Зак. 573. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9,
каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***